Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
4 САКАВІКА 2020 г. СЕРАДА № 43 (29157)

## ДЗЕЛЯ СТАБІЛЬНАСЦІ І НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

*Паважаныя супрацоўнікі органаў унутраных спраў, дарагія ветэраны!*

Віншую вас з прафесійным святам — Днём міліцыі.

Кожны дзень і кожную гадзіну вы знаходзіцеся на пярэднім краі барацьбы са злачыннасцю. Абараняючы правапарадак, гарантаваныя Канстытуцыяй правы, свабоды і жыццё грамадзян, робіце важкі ўнёсак у захаванне стабільнасці ў грамадстве, умацаванне суверэнітэту і незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Перакананы, што асабовы склад органаў унутраных спраў будзе і надалей эфектыўна адказваць на ўсе выклікі і пагрозы і, прымнажаючы слаўныя традыцыі, з гонарам і годнасцю служыць Айчыне.

У гэты святочны дзень жадаю ўсім супрацоўнікам міліцыі, ветэранам, вашым родным і блізкім моцнага здароўя, сямейнага шчасця, поспехаў у нялёгкай, але вельмі важнай і патрэбнай працы на карысць нашай краіны і народа.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алена ШОРР, намеснік начальніка ўпраўлення рэалізацыі дзяржаўных ІКТ-праектаў і закупак Мінсувязі:**

*«Урад паставіў задачу кропкава пачынаць лічбавізацыю, паколькі планава яе па ўсёй краіне адразу зрабіць немагчыма. Пачалі з пілотнага праекта па ўкараненні канцэпцыі «разумнага горада» ў Оршы ў 2019 годзе, зрабілі адаптацыю тыпавой канцэпцыі. Сёлета плануецца яе ўкараніць яшчэ ў дзесяці гарадах: Баранавічах, Пінску, Наваполацку, Полацку, Мазыры, Лідзе, Барысаве, Салігорску, Маладзечне і Бабруйску. Таксама ў 2020-2021 гадах ёсць намер укараніць канцэпцыю ў Мінску. Лічбавізацыя мяркуецца як праект, які развіваецца ад пілотнага і маштабуецца на ўсю краіну».*

# На чыгунцы ўсё спакойна!




Узвод патрульна-паставой службы міліцыі грамадскай бяспекі Аршанскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце (АУСТ) кругласутачна нясе службу на чыгуначных вакзалах і станцыях. Камандуе ўзводам капітан міліцыі Сяргей БЯЛКОЎ *(на фота ў цэнтры)*. Мне давялося пазнаёміцца з капітанам і яго напарнікамі па дзяжурстве — інспектарам аддзялення аховы АУСТ малодшым лейтэнантам міліцыі Дзмітрыем ШЫРКЕВІЧАМ і камандзірам аддзялення ўзвода ППСМ старшыной міліцыі Аляксандрам ВАСІЛЬКОВЫМ на станцыі Орша-Цэнтральная.

— Любы чыгуначны вакзал — зона павышанай небяспекі, а такі буйны чыгуначны вузел, як у Оршы, тым больш, — кажа Сяргей Уладзіміравіч. — Мы пільна адсочваем сітуацыю на платформах, перонах і ў вакзальным будынку, суправаджаем пасажырскія цягнікі, электрычкі і саставы рэгіянальных і міжрэгіянальных ліній.

Праз усходнія чыгуначныя вароты нашай краіны ў суткі праходзіць сто пяцьдзясят два пасажырскія саставы, а пасажырапатак у суткі складае ад чатырох да васьмі тысяч чалавек. Супрацоўнікам міліцыі неабходна кантраляваць кожны састаў, каб трымаць належны ўзровень правапарадку.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• Бюджэт ФСАН за 2019 год выкананы з прафіцытам за кошт узносаў на прафпенсіі.

• **Беларусь зробіць для Венгрыі 40 двухпавярховых цягнікоў.**

• Святочны тралейбус курсіруе па вуліцах Віцебска.



• **Беларусь і Эстонія прыступілі да рэалізацыі дамовы аб сацзабеспячэнні.**

• Аўтавакзал «Усходні» ў Мінску адновіць работу ў сярэдзіне сакавіка.

ISSN 1990 - 763X
20043

Сацыяльны ракурс

# НА ПАРАДКУ ДНЯ ПРАФСАЮЗА...

## Якія праблемы хвалююць работнікаў адукацыйнай галіны?

**За пяць апошніх гадоў у арганізацыйныя структуры Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі паступіла больш за 345 тысяч зваротаў. Асноўная іх тэматыка — просьбы аб аказанні матэрыяльнай дапамогі, пытанні звальнення і працаўладкавання, кампенсацыя кошту санаторных пуцёвак і іншыя. Таксама за гэты час пры садзейнічанні спецыялістаў прафсаюза работнікам адукацыйнай галіны вярнулі каля двух мільёнаў рублёў, якія былі незаконна ўтрыманыя ці не выплачаныя наймальнікамі. Акрамя таго, юрысты галіновага прафсаюза склалі 121 іскавую заяву і прадстаўлялі інтарэсы работнікаў у судзе 41 раз. Праз суд на працоўным месцы былі адноўлены 13 чалавек. Гэтыя лічбы былі агучаны падчас X з'езда Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.**

### ФІНАНСАВЫ ДАБРАБЫТ

Сярод галіновых прафсаюзаў Беларускі прафесійны саюз работнікаў адукацыі і навукі — першая па колькасці арганізацыя, якая аб'ядноўвае ў сваіх шэрагах больш за 610 тысяч чалавек: прадстаўнікоў як дзяржаўных, так і прыватных устаноў адукацыі, навучэнскую моладзь, аспірантаў, дактарантаў, работнікаў Нацыянальнай акадэміі навук. Іх праблемы, занятасць і заробак — штодзённы клопат прафсаюзнай арганізацыі. 15 апошніх гадоў **старшынёй ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі быў Аляксандр БОЙКА.** Таму менавіта ён і выступаў на з'ездзе са справаздачай за апошнюю пяцігодку (на новы тэрмін старшынёй абраная Таццяна ЯКУБОВІЧ).

СТАР. 3

Чвэрць стагоддзя 25

Генадзь САЛАВЕЙ:

# «Людзі застаюцца працаваць на Гомельшчыне»

Старшыня Гомельскага аблвыканкама ў традыцыйнай рубрыцы «Звязды», прысвечанай развіццю краіны на працягу 25 гадоў, разважае аб сённяшнім і заўтрашнім днях Гомельшчыны



***— Генадзь Міхайлавіч, раскажыце, калі ласка, пра асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна.***

— Аснова эканомікі вобласці — прамысловы комплекс, які фарміруе каля 40 % валавага рэгіянальнага прадукту вобласці. Прамысловасць Гомельшчыны сёння — гэта больш за дзвесце буйных і сярэдніх, а таксама звыш тысячы малых прамысловых прадпрыемстваў. Многія з тых, што робяць значны ўнёсак у эканоміку рэгіёна, ведаюць усе. Гэта «Беларуснафта», «Мазырскі НПЗ», «БМЗ», «Гомсельмаш», «Гомельшкло», «Гомельскі хімічны завод», «СветлагорскХімвалакно», «Рагачоўскі МКК», «Спартак» і іншыя.

СТАР. 8—9

З першых вуснаў

# «Настаў час канчаткова прыняць той факт, што ў энергетычных пытаннях трэба разлічваць толькі на сябе»

**На гэтым акцэнтаваў увагу Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытаннях забеспячэння эфектыўнай работы нафтаперапрацоўчага комплексу краіны ў 2020 годзе і на перспектыву, якая адбылася ўчора ў Палацы Незалежнасці.**

## Выключыць манапалізм

«На працягу апошняга стагоддзя вуглевадароды былі і застаюцца адным з ключавых фактараў у сусветных эканамічных і палітычных адносінах. Асобныя дзяржавы зразумелі, што пры дапамозе вентыля на нафтавай трубе выгадныя ім пытанні вырашаюцца значна лягчэй, — распачаў нараду Прэзідэнт. — Не думайце, што я ківаю тут на адну толькі Расію. Гэта стала нормай для дзяржаў планеты, якія маюць ад Госпада такое шчасце».

На жаль, нягледзячы ні на якія ўзаемныя абавязацельствы, такая практыка стала выкарыстоўвацца і ў адносінах да Беларусі, адзначыў кіраўнік дзяржавы. Умовы пастаўкі нафты ва ўльтыматыўнай форме ўвязваюцца з іншымі праблемамі, якія жадае вырашыць краіна-пастаўшчык. І адбываецца гэта без аглядкі на дзеючую дагаворную базу і прынцыпы пабудовы нашых адносін, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«У выніку ў цяперашні момант мы недаатрымоўваем каля мільёна тон сыравіны штомесяц, — заявіў Прэзідэнт. — ***І справа тут не толькі ў тым, што нехта за вентыль хапаецца. Справа яшчэ і ў тым, што мы самі вінаваты, што не дыверсіфікавалі ў свой час пастаўкі нафты. Манапалізм заўсёды прыводзіць да падобных вынікаў***. Але, на жаль, на гэты прадукт завязаныя не толькі патрэбы ўнутранага рынку паліва, але і стабільная работа хімічных, іншых прадпрыемстваў краіны».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, нематываваныя дзеянні ў сферы паставак нафты негатыўна ўплываюць на валавы ўнутраны прадукт і даходы бюджэту, хоць задача дыверсіфікацыі крыніц эканамічнага росту стаіць перад урадам ужо не адзін год.

«***Разлічваю, што ў праграме на чарговую пяцігодку будзе сфарміраваны канкрэтны план, як знізіць удзельнасць умоў паставак нафты для фарміравання ВУП»***, — запатрабаваў беларускі лідар.



Нафтаправод «Адэса—Броды» таксама плануецца задзейнічаць у транзіце нафты ў Беларусь.

З іншага боку, сітуацыя, якая склалася, аказалася нават у нечым карысная: «***Мы неабгрунтавана зацыкліліся на некалькіх пастаўшчыках і не маем доўгатэрміновых альтэрнатыўных крыніц сыравіны***. Нафта — не манапольны тавар, і ахвотных працаваць з намі дастаткова нават у самой Расіі. Пастаўшчыкоў трэба знаходзіць, з імі трэба дамаўляцца. І гэта задача нумар адзін, — абазначыў Аляксандр Лукашэнка. — Асабліва ў сённяшняй няпростай сітуацыі, якая склалася ў свеце, у тым ліку з нашым партнёрам-манапалістам».

Прэзідэнт паведаміў, што, па інфармацыі саміх расіян, пастаўкі нафты ў Кітай у іх скараціліся на траціну. «Гэта не толькі ў Кітай. Нафта сёння імгненна таннее, — дадаў ён. — І ў цяперашняй сітуацыі гэта іграе нам на карысць і падштурхоўвае нас на тое, каб мы маглі дамовіцца з пастаўшчыкамі, і не толькі ў Расіі, але і з альтэрнатыўнымі».

Пры гэтым, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, мы не ставім пытанне так, што не будзем купляць расійскую нафту.

«Будзем, колькі б яна ні каштавала. Бо гэтая нафта і яе здабыча, транспарціроўка ствараліся ў тым ліку і рукамі беларусаў — тымі пакаленнямі, за якімі мы з вамі прыйшлі. І лагістыка тут самая зручная. Але, вядома, мы не будзем поўзаць на каленях 31 снежня ўвесь час, вымольваючы гэтую нафту».

Калі знікне манапалізм, лягчэй будзе дамаўляцца і па цэнах, слушна заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён папрасіў далажыць, якія вынікі ўжо дасягнутыя на гэтым кірунку і якія ўрад бачыць перспектывы.

## Пабудаваць добрую лагістыку

Другое пытанне — лагістыка паставак. Яго трэба распрацоўваць не менш інтэнсіўна, чым першае, указаў Прэзідэнт.

І аднымі толькі дагаворамі на транспарціроўку нафты яго не вырашыць, лічыць Аляксандр Лукашэнка: неабходны комплексныя і сістэмныя інфраструктурныя рашэнні, трэба прадумаць магчымасць рэалізацыі сумесных праектаў з замежнымі кампаніямі — уласнікамі сыравіны.

«Настаў час канчаткова прыняць той факт, што ў энергетычных пытаннях трэба разлічваць толькі на сябе, а ў крытычны момант нават найбліжэйшы партнёр будзе кіравацца толькі логікай уласных інтарэсаў», — канстатаваў лідар краіны.

Прэзідэнт нагадаў, што ў Беларусі два буйныя, прасунутыя і нядрэнныя прадпрыемствы па перапрацоўцы нафты ў Наваполацку і Мазыры, пэўны этап мадэрнізацыі якіх завяршаецца сёлета.

З улікам іх размяшчэння кіраўнік дзяржавы прапанаваў дыверсіфікацыю паставак і магчымыя маршруты. На паўднёвым кірунку — праз Украіну па нафтаправодзе Адэса—Броды. Што датычыцца поўначы, можна працаваць з Эстоніяй, Латвіяй і Літвой і прадаваць нафтапрадукты паўночным суседзям.

«***Рынкі ёсць — добрыя, блізкія. Але патрэбна лагістыка***. За апошнія месяцы мы многае прапрацавалі па пастаўках нафты, — паведаміў кіраўнік дзяржавы. — Я ўжо казаў, што ***каля 40—50 працэнтаў нафты мы па-ранейшаму будзем купляць у Расіі (калі Расія захоча)***, калі канчаткова дыверсіфікуемся. ***А па 30 працэнтаў мы можам купляць з партоў Балтыкі і з Адэсы***. Гэта будзе тры крыніцы. ***Мы цалкам па пастаўках нафты можам дыверсіфікавацца***».

Праблема пабудовы трубаправода з балтыйскіх партоў таксама вырашальная, перакананы Прэзідэнт. «Вельмі сур'ёзныя былі заявы, намеры з боку Злучаных Штатаў Амерыкі, з дзяржсакратаром я на гэту тэму гаварыў — дапамагчы нам з інфраструктурай і пастаўкай нафты, — нагадаў кіраўнік дзяржавы. — Пампеа сам прапанаваў па канкурэнтных цэнах (вы чулі) гэту нафту. І вы бачылі, на Мюнхенскай канферэнцыі была заява — яны выдзелілі мільярд долараў для пабудовы аб'ектаў лагістыкі, гэта значыць для пастаўкі нафты. У тым ліку мы можам разлічваць, што атрымаем ад іх зусім танныя крэдыты на пабудову той жа трубы з Балтыкі».

Паўтара — два гады — абазначыў Прэзідэнт тэрмін для ўрада на пабудову перамычак у трубаправодзе, каб цалкам закальцаваць пастаўкі з паўднёвага і паўночнага заводаў. Ён назваў прыкладную суму, якую краіна самастойна зможа знайсці на гэта, — 100—120 мільёнаў долараў.

«Трэба проста варушыцца!» — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы.

Паводле інфармацыі прэм'ер-міністра Сяргея Румаса, з канца снежня мінулага года беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы вымушаны працаваць ва ўмовах зніжанай загрузкі вытворчых магутнасцяў. «Аб'ём перапрацоўкі нафты ў студзені—лютым 2020 года склаў 1 мільён 850 тысяч тон нафты («Нафтан» — 892 тысячы тон, Мазырскі НПЗ — 962 тысячы тон). Дзякуючы пастаўкам нафты кампаніямі Гуцэрыева і рэзерву, які ёсць у краіне, а таксама пастаўкам альтэрнатыўнай нафты забяспечана беспераапынная работа НПЗ», — адзначыў кіраўнік урада.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**• У тэму**

**Вынікі нарады журналістам пракаментаваў старшыня канцэрна «Белнафтахім» Андрэй РЫБАКОЎ.**

«Асноўная задача, якую абазначыў кіраўнік дзяржавы, — працяг яшчэ большымі тэмпамі работы па пастаўцы нафты з альтэрнатыўных крыніц, — сказаў ён. — У нас больш традыцыйна — вялікія пастаўшчыкі, і вы іх усе ведаеце. Цяпер па даручэнні кіраўніка дзяржавы мы вядзём актыўную работу па прыцягненні на перапрацоўку нафты гатунку «Юралс» на нашы перапрацоўчыя заводы менавіта невялікіх расійскіх кампаній па здабычы. Ужо ў сакавіку ацэньваем першыя пастаўкі. Далей будзем пашыраць супрацоўніцтва. Гэта таксама стварэць добрае канкурэнтнае асяроддзе як на рынках Беларусі, так і на рынку Расійскай Федэрацыі».

Што датычыцца вялікіх расійскіх кампаній, то супрацоўніцтва іх з Беларуссю не закрытае, удакладніў Андрэй Рыбакоў.

«Пакуль няма тых дамоўленасцяў, на якія мы разлічваем. Паралельна і актыўна вядзём работу па іншых кірунках, — растлумачыў ён. — Як па самым шырокім расійскім вектары, так і па знешнім перыметры па пастаўках іншых гатункаў нафты».

Напярэдадні Андрэй Рыбакоў па выніках сустрэчы прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Румаса з прэзідэнтам дзяржаўнай нафтавай кампаніі Азербайджана Socar паведамляў, што тая можа паставіць у Беларусь у 2020 годзе да мільёна тон нафты, далей аб'ёмы будуць нарошчвацца.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Партыя Нетаньяху лідзіруе на трэціх за год выбарах у Ізраілі



«Лікуд» набірае 29,35 % галасоў і, па папярэдняй ацэнцы, атрымлівае 35-36 мандатаў у Кнесеце, піша NEWSru Israel. Бліжэйшы сапернік партыі Нетаньяху — апазіцыйны блок «Кахоль Лаван» Бені Ганца мае 26,34 % і 32 мандаты. На трэцім месцы «Аб'яднаны арабскі спіс» з 12,91 % (15—16 мандатаў). Усяго ў выбарах удзельнічалі 29 партый. Такім чынам, «Лікуд» набірае найбольшую колькасць мандатаў, атрымлівае права на фарміраванне кааліцыі і мае рэальны шанц на гэты раз яе сфарміраваць. Вынікі сталі нечаканасцю для многіх, паколькі апытанні грамадскай думкі напярэдадні выбараў сведчылі аб роўных шанцах двух асноўных кандыдатаў і магчымасці яшчэ адных, чацвёртых выбараў, адзначае «Бі-бі-сі».

## Распаўсюджванне каранавіруса палепшыла экалагічную сітуацыю ў Кітаі

Спадарожнікавыя здымкі паказваюць, што ўзровень забруджвання паветра ў Кітаі прыкметна скараціўся, паведамляе «Бі-бі-сі» са спасылкай на дадзеныя НАСА. Як адзначаюць ва ўпраўленні, як мінімум часткова гэта тлумачыцца змяншэннем вытворчасці, выкліканым каранавірусам. Многія фабрыкі ў Кітаі закрываліся, каб спыніць распаўсюджанне віруса і выключыць заражэнне рабочых. Па даных НАСА, спачатку значнае змяншэнне ўтрымання гэтага двухвокісу азоту ў атмасферы было зафіксавана ў раёне Ухана — горада, з якога і пачаў распаўсюджвацца вірус COVID-19. Скарачэнне ўзроўню выкідаў адпавядае перыяду ўступлення ў сілу абмежаванняў на перамяшчэнне і вытворчасць.

У НАСА заяўляюць, што ўпершыню бачаць такое рэзкае змяненне ў сувязі з адной канкрэтнай падзеяй. Раней змяншэнне канцэнтрацыі двухвокісу азоту назіралася падчас эканамічнага крызісу 2008 года, але тады зніжэнне адбывалася паступова.

## Apple заплаціць 500 мільёнаў долараў за запаволенне айфонаў

Кампанія Apple пойдзе на сусветнае пагадненне з уладальнікамі iPhone, якія падалі ў суд на брэнд з-за наўмыснага запаволення прадукцыйнасці старых мадэляў, каб пераканаць карыстальнікаў купіць новыя смартфоны або памяняць батарэю, паведаміла Reuters. Кампанія згодная выплаціць заяўнікам $500 млн — з разліку па $25 на кожнага, хто звярнуўся ў суд. Сусветнае пагадненне было прапанавана на мінулым тыдні і патрабуе адабрэння акруговага суддзі каліфарнійскага Сан-Хасэ. Вядома, што Apple так і не прызнала сваю віну і пайшла на здзелку, каб пазбегнуць вялікіх выдаткаў на судовыя цяжбы. Сусветнае пагадненне закране амерыканскіх уладальнікаў iPhone 6, 6 Plus, 6s, 6s Plus, 7, 7Plus або SE, якія працуюць на базе iOS 10.2.1 або больш позняй версіі. Акрамя таго, яно ўключае ў сябе ўладальнікаў iPhone 7 і 7 Plus з версіяй iOS 11.2, усталяванай да 21 снежня 2017 года.

# На ключавым участку

## Новым віцэ-прэм'ерам Беларусі стаў Юрый Назараў

**Нафтахімічны комплекс краіны з учарашняга дня — у зоне адказнасці Юрыя Назарава, які дагэтуль узначальваў канцэрн «Беллеспапераапрам».**

**«Кірунак ключавы. Для краіны ён сёння найважнейшы —** не сельская гаспадарка, не сацыяльная сфера, нават не эканамічныя пытанні і планаванне, а менавіта тая сфера, якой вам давядзецца займацца. Таму я бы прасіў вас, каб вы ўключыліся ў гэтую працу і забяспечылі гэты ўчастак», — звярнуўся да новага віцэ-прэм'ера кіраўнік дзяржавы. Назначэнне, якое стала цалкам нечаканым, апярэдзіла нараду ў Прэзідэнта па нафтаперапрацоўчым комплексе.

Згодна з Указам Прэзідэнта, Ігар Ляшэнка вызвалены ад пасады намесніка прэм'ер-міністра ў сувязі з пераходам на іншую пасаду.

**Варвара МАРОЗАВА.**

На слыху

# Смерцяў ад каранавіруса ў Беларусі няма!

## Міністэрства аховы здароўя абвергла паведамленне расійскага Першага канала

**Міністэрства аховы здароўя абвергла паведамленне расійскага Першага канала аб выпадку смерці ад каранавіруса ў Беларусі. 1 сакавіка ў выпуску навін на гэтым канале вядучы ў студыі заявіў, што «першыя смерці зафіксаваны ў ЗША, Аўстраліі, Тайландзе, Беларусі».**

«Дадзеная інфармацыя ў дачыненні да Беларусі з'яўляецца хлуснёй», — адзначае прэс-служба Міністэрства аховы здароўя. «У сувязі з распаўсюджаннем фэйкавай у дачыненні да нашай краіны інфармацыі будуць прыняты адпаведныя меры рэагавання таксама па лініі Міністэрства замежных спраў», — гаворыцца ў паведамленні.

Паводле апошніх даных, колькасць краін, акрамя Кітая, дзе распаўсюдзіўся новы вірус, дасягнула 64. У Еўрапейскім рэгіёне выяўлена 2 734 выпадкі, памерла 56 чалавек. Самае вялікае распаўсюджанне зарэгістравана ў Італіі — больш за дзве тысячы хворых. Першы выпадак заражэння выяўлены ўчора і ва Украіне — у грамадзяніна, які вярнуўся з Італіі.

У Беларусі выяўляюць тых, хто кантактаваў з трыма шпіталізаванымі асобамі, у якіх пацвердзілі каранавірус. У Віцебску тры класы розных школ горада і група аднаго з каледжаў часова пераведзены на дыстанцыйнае навучанне.

— На 14 дзён іх пакінулі дома. Вучэбны працэс не спынены — яны атрымліваюць заданні ад настаўнікаў і выконваюць іх, — адзначыла **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН.**

Нагадаем, што ў абласным цэнтры ў адной з жанчын пасля паездкі ў Італію выявілі фрагмент РНК, які належыць каранавірусу. Яна, а таксама яе блізкія, у тым ліку чацвёра дзяцей, шпіталізаваны.

### Каму варта здаць аналізы на каранавірус?

— У пунктах пропуску праз граніцу праводзяць забор матэрыялу ў асоб, якія (у перыяд да 14 дзён таму) прыбылі з эпідэмічна неспрыяльных па каранавіруснай інфекцыі краін. Па стане на 3 сакавіка — гэта Кітай, Іран, Паўднёвая Карэя, Італія. Пры вяртанні з дадзеных краін на борце самалёта, у цягніку, на аўтамабільным транспарце ў пункце пропуску падчас пагранічнага кантролю пасажырам прапануюць запоўніць «Анкету прыбылага», — праінфармавала прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія Барадун. — Гэтыя звесткі могуць быць выкарыстаны для арганізацыі медыцынскага назірання і іншых неабходных мерапрыемстваў, перадаюцца ў паліклініку па месцы жыхарства для арганізацыі медыцынскага назірання.

На базе інфекцыйных бальніц, асобных паліклінік і кабінетаў інфекцыйных хвароб праводзіцца абследаванне гэтых грамадзян. Тут таксама могуць прапанаваць запоўніць анкету, калі яна не запаўнялася на граніцы.

— Варта звярнуць увагу, што асобы, якія мелі цесны кантакт з пацыентам, у якога пацверджана каранавірусная інфекцыя (так званыя «кантакты 1-га ўзроўню») ізалююцца і праходзяць лабараторнае абследаванне па месцы ізаляцыі, — падкрэсліла Юлія Барадун. — «Кантакты 2-га ўзроўню» (тыя, у каго імавернасць заражэння вельмі нізкая: кантакт быў непрацяглы ці няблізкі), знаходзяцца пад медыцынскім назіраннем, іх лабараторнае абследаванне немэтазгоднае.

Калі на працягу 14 дзён у тых, хто вярнуўся з эпідэміялагічна небяспечных краін, а таксама ў асоб, якія адносяцца да «кантактаў 2-га ўзроўню», узнікнуць сімптомы рэспіраторнага захворвання (павышэнне тэмпературы больш за 37,1, кашаль і іншыя праявы), неабходна выклікаць хуткую дапамогу і паведаміць пра факт вяртання (з указаннем даты) ці пра тое, што вы знаходзіцеся пад медыцынскім назіраннем як кантактная асоба. Лабараторнае абследаванне будзе праведзена па месцы шпіталізацыі.

— З улікам эпідэміялагічнай абстаноўкі ўсе астатнія грамадзяне праходзяць лабараторныя абследаванні на каранавірусную інфекцыю COVID-19 толькі пры наяўнасці паказанняў і па накіраванні ўрача, — адзначыла Юлія Барадун.

Тэлефон гарачай лініі па пытаннях прафілактыкі інфекцый ў Рэспубліканскім цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя: +375(29) 156-85-65, званкі прымаюцца ў рабочыя дні з 8:30 да 13:00 і з 13:30 да 18:00.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШМАТ БІЯТЛОНА НЕ БЫВАЕ

## У Раўбічах стартуе дзявяты этап Кубка IBU

**Турнір пачнецца спрынтарскімі гонкамі сярод мужчын і жанчын. Плануецца, што на гэтым этапе беларуская каманда будзе прадстаўлена наступным складам: Віктар Крыўко, Максім Варабей, Ягор Казарынаў, Адэліна Сабітава, а таксама магчымы ўдзел Дзінары Алімбекавай, якая не адправілася на этап Кубка свету ў Нове-Места.**

З-за неспрыяльных умоў надвор'я ў Раўбічах аргкамітэтам было прынята рашэнне аб змене праграмы спаборніцтваў і часу старту фінальнага Кубка IBU. Спаборніцтвы па спрынце будуць праводзіцца ў сераду і чацвер з 20-секундным інтэрвалам, а гонкі з масавым стартам закрыюць спаборніцкую праграму ў пятніцу.

У Кубку IBU ў Раўбічах прымуць удзел прадстаўнікі 20 краін. На старт выйдуць 80 мужчын і 71 жанчына. Для зручнасці балельшчыкаў падчас спаборніцтваў у Раўбічах прадугледжаны аўтобусны маршрут, які будзе арганізаваны з 4 да 6 сакавіка ад станцыі «Барысаўскі тракт».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

**Новы расклад спаборніцтваў:**

**Серада, 4 сакавіка**
12:00 Спрынт, жанчыны
15:00 Спрынт, мужчыны

**Чацвер, 5 сакавіка**
11:00 Спрынт, жанчыны
14:00 Спрынт, мужчыны

**Пятніца, 6 сакавіка**
11:00 Мас-старт 60, жанчыны
13:30 Мас-старт 60, мужчыны

# НА ПАРАДКУ ДНЯ ПРАФСАЮЗА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— ЦК прафсаюза пастаянна засяроджваў увагу органаў дзяржаўнага кіравання, дэпутацкага корпуса і грамадства ў цэлым на праблеме павышэння сацыяльнага статусу педагагічных работнікаў. Бо фінансавы і маральны дабрабыт работнікаў галіны — гэта ключавыя фактары яе якаснага росту, — падкрэсліў у сваім выступленні Аляксандр Бойка.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сярэднямесячная заработная плата ў адукацыі за 2019 год склала 767,6 рубля: у педагагічных работнікаў — 900,2 рубля, настаўнікаў — 945,5 рубля, прафесарска-выкладчыцкага складу — 1357,7 рубля. Намінальная налічаная заработная плата за 2015—2019 гады павялічылася на 283,8 рубля, або на 58,7 %.

Аднак, нягледзячы на ўсе меры, што прымаюцца, **сістэма адукацыі па ўзроўні налічанай сярэднямесячнай заработнай платы сярод паказчыкаў па асобных відах эканамічнай дзейнасці знаходзіцца на перадапошняй пазіцыі.** Рост рэальнай заработнай платы з 2015 па 2018 гады ў адносінах да індэксу спажывецкіх коштаў не пакрываў рост коштаў на тавары і паслугі.

**«Таму наша агульная з сацыяльнымі партнёрамі задача — выхад на сярэднюю заработную плату ў галіне на ўзроўні 80 % ад сярэдняй па краіне, а заробкі ў прафесарска-выкладчыцкага саставу павінны складаць 150 % ад сярэдняга заробку па краіне», — адзначыў Аляксандр Бойка.**

З 1 студзеня бягучага года падыходы да аплаты працы работнікаў бюджэтнай сферы змяніліся. На «гарачую лінію» ФПБ паступілі 252 званкі ад розных катэгорый работнікаў адукацыі (пераважна ад педагогаў) па пытаннях іх прымянення.

— Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі, намі, Міністэрствам адукацыі была праведзена вельмі вялікая тлумачальная работа, але сказаць, што дайшлі да кожнага члена прафсаюза, нельга, паколькі ёсць шмат тэхнічных памылак, шмат завышаных чаканняў у педагогаў. Больш памяркоўнасці і прафесіяналізму неабходна ў гэтай сітуацыі праявіць і бухгалтарскім службам, — лічыць Аляксандр Бойка.

## ЗАРОБКІ БУХГАЛТАРАЎ І КІРАЎНІКОЎ

— У лютым работнікі бюджэтных арганізацый атрымалі заработную плату, налічаную ў адпаведнасці з новымі ўмовамі аплаты працы. Нягледзячы на вялікую тлумачальную працу ў працоўных калектывах, якая праводзіцца сумесна са спецыялістамі ўпраўленняў і аддзелаў адукацыі, пытанняў узнікае шмат. Абсалютная большасць іх здымаецца на месцах, частка — у ходзе «гарачых ліній» і маніторынгаў. Але ёсць пытанні, якія могуць быць вырашаны толькі шляхам унясення карэктываў у нарматыўныя дакументы, — адзначыла ў сваім выступленні **старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Вера ГРЫШЭЧКА.** — Перш за ўсё, пытанні датычацца ўстаноўленых пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны тарыфных разрадаў па пасадах «бухгалтар», «эканаміст» і «юрысконсульт». Гэта ў абсалютнай большасці спецыялісты з вышэйшай адукацыяй. Пры стажы працы да пяці гадоў, наяўнасці надбаўкі па кантракце і 5 % прэміі іх заработная плата застаецца ніжэйшай за мінімальную.

У складанай сітуацыі аказаліся кіраўнікі ўстаноў адукацыі. Па-першае, частцы работнікаў неабходна было кампенсаваць страты па стажу, даплаціць да мінімальнай заработнай платы. Але прапісаць гэта непасрэдна ў палажэннях калектывы не могуць. Па-другое, выраўноўваючы заработную плату за студзень і снежань, намеснікам кіраўнікоў і кіраўнікам структурных падраздзяленняў, якія маюць вучэбную нагрузку, давялося даплочваць вялікія сумы з фонду за высокія дасягненні ў працы, паколькі надбаўка за спецыфіку працы ў сферы адукацыі ім устаноўлена ў памеры 30 %, як і настаўнікам без катэгорыі. А гэтыя пасады займаюць лепшыя работнікі, як правіла, з першай і вышэйшай катэгорыямі. Логіка падказвае, што павышэнне павінна быць хоць бы на ўзроўні першай катэгорыі. Па-трэцяе, складана растлумачыць работнікам, чаму паменшыўся працэнт надбаўкі па кантрактах. Калі б яго пакінулі на тым жа ўзроўні, змаглі б павялічыць нарміруемую частку заработнай платы.

Вера Грышэчка паведаміла, што ў Гродзенскай вобласці вялікая ўвага ўдзяляецца рабоце з маладымі спецыялістамі. За кожным з іх замацоўваецца настаўнік. Згодна з калектыўным дагаворам, выдзяляецца матэрыяльная дапамога на кампенсацыю выдаткаў за наём жылога памяшкання і праезд да месца працы.

Прымаюцца меры па забеспячэнні жыллём. Гродзенскі гаркам прафсаюза сумесна з аддзелам адукацыі гарвыканкама вядуць улік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы працы. За пяць гадоў з падтрымкай дзяржавы пабудавана 130 кватэр для работнікаў сістэмы адукацыі горада. Актыўна працуюць па прадастаўленні месцаў у інтэрнатах розных арганізацый Гродна і Навагрудскі раён, арэнднага жылля — Воранаўскі і Астравецкі раёны, Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы. У 2019 годзе 30 маладых спецыялістаў у Астраўцы былі забяспечаны арэндным жыллём.

## НАРМАТВОРЧЫЯ ПРАБЕЛЫ

Важную праблему ўзняў на з'ездзе **старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Раман ЧУЛЬ.** З ёй сутыкнуліся ўсе вучэбныя ўстановы краіны пасля зацвярджэння Саветам Міністраў напрыканцы года новай рэдакцыі «Палажэння аб парадку фарміравання пазабюджэтных сродкаў, ажыццяўлення выдаткаў, звязаных з дзейнасцю, што прыносіць даходы, накіраванні і парадку выкарыстання сродкаў, якія засталіся ў распараджэнні бюджэтнай арганізацыі».

**У дакуменце не прадугледжана магчымасць прэміравання студэнтаў і навучэнцаў, якія атрымліваюць адукацыю на платнай аснове.** Кіраўнікі ўстаноў адукацыі пазбаўлены цяпер магчымасці заахвочваць студэнтаў і навучэнцаў, якія дабіліся высокіх паказчыкаў у навуцы, спорце, грамадскай рабоце і г. д., адмяняецца спартыўнае харчаванне студэнтаў высокай спартыўнай кваліфікацыі, льготнае харчаванне студэнтаў. З'явіліся пытанні па фінансаванні выязных рэспубліканскіх універсіяд і спартакіяд.

— Прывяду маленькі прыклад. Наш універсітэт у якасці валанцёраў накіраваў на II Еўрапейскія гульні 248 студэнтаў, а ў мерапрыемствах па перапісе насельніцтва летась удзельнічалі 156 студэнтаў. 40 % ад агульнай іх колькасці складалі студэнты-платнікі. У 2019 годзе яны былі заахвочаны выплатамі з пазабюджэту ў памеры ад 15 да 50 рублёў кожны, — паведаміў Раман Чуль. — У сувязі з гэтым прашу ініцыяваць унясенне змяненняў у пастанову Савета Міністраў, прадугледзеўшы магчымасць ажыццяўляць выплаты стымулюючага характару навучэнцам з пазабюджэтных сродкаў устаноў адукацыі ў часці сум перавышэння даходаў над выдаткамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Нераўнадушныя

# ПА ПАКЛІЧЫ СЭРЦА

## У Мінску ўганаравалі маладых людзей, якія дапамаглі затрымаць злачынцаў



Фота прэс-службы МУС.

**Не раз падчас раскрыцця злачынстваў міліцыя звяртаецца да грамадзян з просьбай дапамагчы пазнаць чалавека па фота або паведаміць інфармацыю пра яго месцазнаходжанне. Тое ж датычыцца і паводзін на дарозе — калі кіроўца не ў зусім адэкватным стане выедзе на дарогу, то быць бядзе. А нярэдка злачынцы затрымліваюцца і па гарачых слядах.**

Так, мінулай вясной краіну абляцела навіна пра тое, як у Полацкім раёне трое школьнікаў дапамаглі затрымаць чалавека, які абвінавачваўся ў педафіліі. На беразе ракі яны ў хмызняку заўважылі мужчыну, у якога на каленях сядзела паўголая дзяўчынка. Ён паспрабаваў уцячы, але адзін падлетак пазваніў бацьку, расказаў пра тое, што здарылася, і папрасіў выклікаць міліцыю. Вось такая перадгісторыя затрымання.

Для таго каб аддзячыць неабыякавым да чужой бяды людзям, у панядзелак з імі на базе часці 3214 сустрэўся **міністр унутраных спраў Юрый КАРАЕЎ.** Шаснаццаці гасцям, якія прыехалі з усёй краіны, паказалі ўмовы, дзе жывуць і служаць салдаты ўнутраных войскаў, зброю і тэхніку.

— Мы вырашылі ўпершыню правесці такую акцыю — запрасіць да сябе неабыякавых да грамадскага парадку маладых людзей і ўручыць ім нашы нагрудныя знакі «За садзейнічанне», — расказаў Юрый Караеў. — А заадно і паказаць побыт спецназаўцаў. Думаем, што гэта будзе старт добрай традыцыі. Паразмаўляў падчас чаявання з хлопцам з Чачэрска. Ён дапамог у затрыманні зламысніка, які краў маёмасць з аўтамабіляў. Я пацікавіўся — дзе служыць тэрміновую службу?

Аказалася, што гэта ў мінулым пагранічнік. І прыемна, што пазіцыя «мая хата з краю» пацікаў сыходзіць у мінулае. Наогул, было б нядрэнна, калі б пры ўладкаванні на работу падчас сумоўя браліся пад увагу і такія акалічнасці, скіраваныя на бяспеку іншых людзей.

Раману Л. 24 гады. Хлопец працуе слесарам у адной са сталічных фірмаў. Тры месяцы таму ў цэнтры Мінска ён заблакаваў праезд кіроўцу, які быў у стане алкагольнага ап'янення, і ўтрымліваў яго да прыбыцця супрацоўнікаў ДАІ.

— Гэта адбылося на ажыўленым скрыжаванні вуліц Магілёўскай і Жукоўскага. У нядзелю ўвечары я вяртаўся дадому і ўбачыў, што аўтамабіль стаіць на аварыйным на сустрэчнай паласе, — згадвае Раман. — Спярша я гэтаму не надаў значэння. І як быццам спачатку кіроўца паехаў роўна, але неўзабаве аўтамабіль пачало «штарміць». Ён рэзка разганяўся і рэзка тармазіў, ледзь не пашкодзіў два іншыя аўтамабілі. Я пад'ехаў бліжэй да яго і бачу, што стан кіроўцы не зусім нармальны. На наступным святлафоры ён спыніўся і нібы пачаў засынаць. Я стаў побач з ім, выбег, забраў ключы і выклікаў нарад ДАІ. Усё працягвалася хвілін дзесяць—пятнаццаць... Пасля аказалася, што ў крыві таго чалавека было тры праміле алкаголю. Самі разумееце, да кагосьці гэта магло скончыцца вельмі дрэнна.

Яшчэ адзін герой — Яўген П. Ён працуе аператарам на адной з запраўкак. Хлопец нядаўна служыў у спецназе і прызнаецца, што дзякуючы службе стаў вельмі назіральны. Вось гэта і саслужыла яму добрую справу. У снежні мінулага года ён падчас сваёй змены прыкмеціў аднаго з пакупнікоў, чый партрэт ён бачыў у арыенціроўцы. Неўзабаве выдалася вольная хвілінка. Хлопец вырашыў пачытаць навіны на тэлефоне. І быў шакіраваны — той самы пакупнік глядзеў на яго з экрана прылады. Мужчыну шукалі з-за таго, што ён меў дачыненне да забойства, якое днём раней адбылося ў сталіцы. Рука Яўгена тут жа пацягнулася да тэлефона і набрала нумар 102...

Адукацыя

# «МІЛІЦЫЯНЕР — ГЭТА ЮРЫСТ СА ЗНАКАМ ЯКАСЦІ»

**Вядучая навучальная ўстанова ў Беларусі, дзе рыхтуюць будучых міліцыянераў, — гэта Акадэмія МУС. Да старту чарговай уступнай кампаніі засталося не так і шмат. А пытанняў у будучых абітурыентаў і іх бацькоў, як заўжды, хапае. Таму на адмысловай прэс-канферэнцыі ў Доме прэсы прадстаўнікі Акадэміі крыху прыадкрылі завесу таямніцы над навучальным працэсам.**

— Калі параўноўваць курсантаў Акадэміі з іншымі кандыдатамі, якія прыходзяць на службу ў органы ўнутраных спраў з грамадзянскіх ВНУ, то нашы курсанты на галаву вышэйшыя ў практычных ведах, — зазначыў **начальнік Цэнтральнага РУУС Мінска палкоўнік міліцыі Артур ШАХЛАЙ,** які 21 год таму сам скончыў гэтую навучальную ўстанову. — З цягам часу, вядома, і выпускнікі грамадзянскіх вышэйшых навучальных устаноў падцягваюцца і набіраюць досвед, але ў іх ужо няма такой форы па часе. Справа ў тым, што выпускнік Акадэміі МУС — гэта ўжо гатовы супрацоўнік органаў унутраных спраў, які ведае, што такое нарматыўна-прававы акт, які рэгламентуе праваахоўную дзейнасць, ведае, які кодэкс трэба разгарнуць у той ці іншай сітуацыі. Перавага выпускнікоў Акадэміі з улікам дысцыплін, практыкі, стажыровак, якую тыя праходзяць, у тым, што яны падрыхтаваны да стасункаў са злачынцамі, з асобамі, якія стаяць на ўліку. Таму ў нашым РУУС большасць асабістага складу або ўжо мае дыплом Акадэміі, або цяпер вучыцца ў ёй завочна.

У сваю чаргу, **першы намеснік начальніка Акадэміі МУС палкоўнік міліцыі Аляксей БАШАН** абазначыў, што дзве галоўныя апоры падрыхтоўкі, — гэта самі веды і адукацыя. Ён праінфармаваў, што цяпер у навучальнай установы шэсць заказчыкаў. Юрыдычныя кадры рыхтуюцца не толькі непасрэдна для Міністэрства ўнутраных спраў, але і Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта і Міністэрства абароны.

— Усе нашы навучальныя праграмы ўзгадняюцца з ведамствамі, у інтарэсах якога навучаецца курсант. Справа ў тым, што ў нас выбіраюць не проста адукацыю, а будучую прафесію. Яшчэ на этапе падачы заявы мы цікавімся, кім будзе працаваць абітурыент — участковым, у крымінальным вышуку, наркакантролі, аддзеле па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі, супрацоўнікам ДАІ, у Дэпартаменце выканання пакаранняў... Завядзёнкі, што спачатку выпускнікі атрымліваюць дыплом, а пасля думаюць, куды з ім працаўладкавацца, у нас няма. Мы даем класічную адукацыю і інструмент, як яе выкарыстоўваць. Часам кажуць, што ў нас рыхтуюць спецыялістаў па вузкім профілі, а не юрыстаў. Але, як па мне, міліцыянер — гэта юрыст са знакам якасці. Вось уявіце сабе сітуацыю. Хтосьці звярнуўся па юрыдычную дапамогу да юрыста. Ён кажа — так, заканадаўства парушана і трэба звяртацца ў праваахоўныя органы. І ў справу ўступае хто? Міліцыянер. Таму і патрабаванні да ведаў і ўменняў у нашых выпускнікоў вельмі высокія.

Яны комплексна распавядалі пра тое, як у інтэрнэце ідуць грашовыя патокі. Курсанты, якія атрымлівалі веды па супрацьдзеянні злачынствам у віртуальным асяроддзі, цяпер знаходзяцца на пераддыпломнай практыцы.

Добра наладжана ў Акадэміі МУС і зваротная сувязь. Працуе гэта наступным чынам. Пасля пераддыпломнай практыкі куратар аддае ў навучальную ўстанову падрабязную справаздачу пра поспехі курсанта і яго праверанья веды. Пры неабходнасці навучальны працэс можа быць падкарэктаваны. Фідбэк ажыццяўляецца і пасля заканчэння Акадэміі. Пра гэта распавёў **начальнік следча-экспертнага факультэта палкоўнік міліцыі Алег РАЖКО.**

— З першага курса нашы навучэнцы пагружаюцца ў практычную дзейнасць. Выбудавана сістэма практык, дзякуючы якой курсанты маюць магчымасць стажыравацца ў складзе следча-аператыўных груп, выязджаць на канкрэтныя месцы здарэнняў, на свае вочы бачыць узаемадзеянне паміж следчым, аператыўнікамі і іншымі службамі. Дзякуючы гэтаму з першых дзён пасля выпуску ён ведае, што яму трэба рабіць па канкрэтнай крымінальнай справе. У асабістую справу кожнага выпускніка кладзецца спецыяльная анкета. Праз год пасля выпуску яе запаўняе начальнік, дзе і ацэньвае прафесійныя якасці маладога афіцэра. І ўжо пасля гэтага мы глядзім, як трэба дапрацоўваць навучальны працэс.




dompressy.by

З мінулага года ў Акадэміі МУС пачалі рыхтаваць спецыялістаў, якім трэба будзе раскрываць злачынствы ў кіберпрасторы. Пра тое, як гэта адбываецца, распавёў **начальнік кафедры аператыўна-вышуковай дзейнасці факультэта міліцыі Акадэміі МУС палкоўнік міліцыі Аляксей ТУКАЛА.**

— Мы сочым за тэндэнцыямі, якія адбываюцца ў крымінальным асяроддзі. Напрыклад, той жа збыт наркатычных сродкаў цяпер амаль цалкам сышоў у інтэрнэт. На нашы занятки запрашаліся прадстаўнікі Парка высокіх тэхналогій і Нацыянальнага банка.

# ДАНІНА ПАМЯЦІ

**У сталічных міліцыянераў ёсць пачэсная традыцыя. Напярэдадні прафесійнага свята кіраўніцтва Галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама сустракаецца з роднымі і блізкімі тых, хто загінуў, выконваючы службовыя абавязкі. Сёлета ў крыпце Храма-помніка ў гонар Усіх Святых была закладзена капсула. У ёй сабрана зямля з месцаў пахавання людзей у пагонах. Капсула аздоблена адпаведнай сімволікай.**



Фота Валяр'яна ШКЛЕННІКА.

— Мы пастаянна імкнёмся дапамагаць сем'ям, у якія прыйшло такое гора, — расказвае **начальнік ГУУС Мінгарвыканкама Іван КУБРАКОЎ.** — Увесь час трымаем кантакт, цікавімся, ці ёсць якія-небудзь праблемы, у вырашэнні якіх мы можам паспрыяць. І памяць загінулых калег мы шануем. Нашы супрацоўнікі перыядычна прыязджаюць да месцаў пахаванняў, дзе спачываюць вечным сном іх таварышы.

У сям'ю маёй суразмоўцы Таццяны Палевіч няшчасце прыйшло 14 гадоў таму. Яе муж, лейтэнант міліцыі Аляксандр Палевіч, дзяжурыў разам з калегам на 43-м кіламетры Мінскай кальцавой аўтамабільнай дарогі. Дыслакацыя месца — паміж развязкамі з дарогамі на Бягомль і Заслаўе. Аляксандр Палевіч спыніў аўтамабіль, каб праверыць дакументы кіроўцы. У гэты час прыблізна за кіламетр да нарада «Форд Мандэа» дагнаў грузавік ГАЗ-53, які вёз бочку квасу. «Форд» пайшоў на абгон, але чамусьці справа па паласе разгону. На яго шляху апынуўся Аляксандр Палевіч. Медыкам засталося толькі канстатаваць смерць міліцыянера. Яму зусім нядаўна споўнілася 37. Дома засталіся жонка і 14-гадовая дачка...

— Я тады глядзела фільм, — згадвае жанчына. — Раптоўна пазванілі па дамафоне. Чалавек, які прадставіўся калегам Сашы, папрасіў штосьці перадаць ад яго. Я здзівілася, але дзверы адчыніла. Тут мне і паведамілі пра тое, што адбылося... Час, як кажуць, лечыць, але боль нікуды не сыходзіць. Вось і цяпер трэба на яго магіле помнік падправіць. Крыху пакасіўся ён за гэты час...

Аляксандр Палевіч служыў у Цэнтральным РУУС Мінска. Перавёўся ён туды за тры гады да трагедыі. Завочна вучыўся ў Акадэміі МУС. Меў выслугу 18 гадоў.

**Матэрыялы паласы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Профі

# «ЖАНЧЫНА Ў ПАГОНАХ ЗАЎСЁДЫ ЗАСТАЕЦЦА ДАМАЙ!»

**— За рулём ужо шосты год. На правы кіроўцы здала, каб быць мабільнай. Інакш з маім насычаным графікам нічога не паспець, — спрытна заскокваем у аўтамабіль да ўчастковага інспектара міліцыі Фрунзенскага РУУС сталіцы капітана міліцыі Ірыны ЗАГАРЭЛЬСКАЙ.**



Яна служыць у органах унутраных спраў з 2001 года. Пра свой прафесійны шлях расказвае з задавальненнем:

— Дзесяць гадоў адпрацавала ў Следчым ізалятары № 1 Мінска. Прыйшла 19-гадовай дзяўчынай. Маленькая, худая. Дагэтуль жартую, што мяне выхавалі калегі, — усміхаецца. — На той час служылі там і мае бацькі. Дапамаглі асвоіцца. Увогуле, усё лёгка даецца, калі справа падабаецца.

Па першай адукацыі Ірына кантралёр АТК (эксперт, які ацэньвае якасць прадукцыі на прадпрыемстве). Але па спецыяльнасці не працавала:

— Разумела: не маё. Марыла пра афіцэрскае званне. Паступіла на завочную форму навучання ў каледж МУС у Магілёў. Кіраўніцтва дало накіраванне. Мне заўсёды шанцавала з начальнікамі: за 19 гадоў службы трапляліся выключна прафесіяналы.

## «Участковы — ён усюды і заўсёды»

— Муж цікавіцца машынамі. Якога толькі транспарту ў нас не было! Зараз Дзіма кіроўца-экспедытар міжнародных перавозак. Працэс кажучы, дальнабойшчык, — знаёміць з сям'ёй суразмоўніца. — Цяжка адной з трыма дзецьмі, калі ён у рэйсе. Але і яму са мной таксама нялёгка!

Старэйшаму сыну Ірыны і Дзмітрыя Аляксандру — 16 гадоў, двайнятам Дзянісу і Івану — па 8.

— Усё жыццё дома і на службе мяне акружаюць адны мужчыны. У мяне нават кот мужчынскага полу! Калі шчыра, мне з моцнай паловай чалавецтва прасцей знайсці агульную мову. Люблю, калі ўсё выразна і зразумела, без лішніх слоў.

Участковым інспектарам міліцыі Ірына працуе з 2011 года:

— Шкада губляць калектыў, які склаўся. Вось і затрымалася тут надоўга. Цудоўныя калегі пераважваюць нават амбіцыі! Увогуле, служба — усюды служба. Нідзе не лёгка!

Пра сваю справу капітан міліцыі гатовая расказваць доўга. І робіць гэта з непадробным інтарэсам. У момант гутаркі мабільны тэлефон Ірыны не змаўкае:

— Участковы — ён паўсюль і заўсёды. Чалавек можа патэлефанаваць з нейкай праблемай і раніцай, і ноччу. Я адкажу, нават калі выхадная, але растлумачу, куды далей звяртацца па дапамогу. Калі прапускаю званок, абавязкова перателефаную. Людзі ж не проста хочуць даведацца, як у мяне справы!

Але бывае і такое, прызнаецца міліцыянер:

— Зараз на маім адміністрацыйным участку каля пяці тысяч чалавек. Мы ў асноўным працуем з пажылымі людзьмі і тымі, хто злоўжывае спіртнымі напоямі. Менавіта апошнія часта ладзяць разборкі з бойкамі. Сваіх «падапечных» ведаю добра. Дык вось некаторыя з іх са святамі ў месенджарах віншуюць. Пра Дзень міліцыі згадваюць абавязкова. Здаецца, дробязь, а прыемна. Маленькае пацвярджэнне таго, што ўсё раблю правільна.

## «Бывае, прыйду дадому і плачу»

— Складана размяжоўваць асабістае і работу?

— Так, нават дасвед не дапамагае. Асабліва калі справа датычыцца дзяцей, якія ад безадказнасці бацькоў знаходзяцца ў небяспецы, недаядаюць. Мне як маці бачыць гэта балюча. Бывае, прыйду дадому пасля цяжкай змены і нават плачу, — змаўкае. — Жанчына ў пагонах, за штурвалам самалёта альбо хірургічным сталом заўсёды застаецца дамай — эмацыянальнай!

Усяго ў Фрунзенскім РУУС тры жанчыны-ўчастковыя. Дзве дзеючыя, адна — у дэкрэтным адпачынку.

— Хатнія ведаюць: калі я адразу, як прыходжу са службы, накіроўваюся на кухню, у кватэры павінна настаць цішыня. Мне трэба пабыць сам-насам са сваімі думкамі мінімум хвілін дваццаць. У першую чаргу для таго, каб пераключыцца з работы на сям'ю, — тлумачыць суразмоўніца.

Ірына даражыць падтрымкай родных і з гонарам кажа, што з мужам заўсёды можа абмеркаваць любыя рабочыя моманты:

— Выгаваруся і лягчэй стане. Дзякуй, слухае, — смяецца. —



Дзіма мне і псіхолаг, і сябар. У нас заўсёды было коратка: «Трэба на работу — ніякіх пытанняў». Нават калі гэта святочныя і выхадныя дні. Лічу, сямейныя скандалы часта ўзнікаюць праз тое, што людзі не ўмеюць адно аднаму саступаць. Разбуючыся размаўляць. На жаль, усё часцей можна пачуць «я» замест «мы».

Жанчына прызнаецца: часам дакарае сябе за тое, што з-за работы няшмат часу праводзіць з дзецьмі:

— Напэўна, старэйшы сын таму і вырас такі самастойны. Калі я на службе, муж у рэйсе — двайняты пад яго наглядам. Ён іх і пакорміць, і ўрокі з імі зробіць. А яны ў нас жвавыя!

Аляксандр добра вучыцца. У ваенныя ці сілавыя структуры ісці не плануе: «Хопіць у сям'і аднаго міліцыянера». Хлопец — гуманітарый, хоча паступаць на настаўніка гісторыі.

— Ніводны Новы год я з сям'ёй не правяла — служба. Затое кожны раз выступаю ў ролі Дзеда Мароза. Прыязджаю з дзяжурства ў гадзіны чатыры раніцы і раскладваю пад ёлку падарункі, — дзеліцца. — Ніколі не прасіла ў калег замяніцца на святы. Сем'і ва ўсіх, чым я лепшая?! Адзінае, магу пра спараныя выхадныя спытаць.

## «Дзеці малююць маму ў міліцэйскай форме»

— У нас ёсць гастранамічная традыцыя: раніцу суботы пачынаем з бліноў. Старэйшы ў пятніцу ўвечары закупляе малако, яйкі, муку. Персанальная Масленіца кожны тыдзень, — кажа Ірына. — Пакуль смажацца бліны, стаўлю варыцца суп, бо ўжо і абед хутка! Так каля пліты выхадныя і праходзяць. Лічу, што крыху разбэсціла сваіх мужчын. Страву на другі дзень пасля яе прыгатавання есці не хочуць. Хатнія любяць мяса і салаты. З выпечкі — чабурэкі, беляшы, — дадае. — Ведаеце, у першую чаргу ў сям'і я мама, жонка, а ўжо потым супрацоўнік міліцыі. Таму ствараць утульнасць у доме мая задача.

На пытанне, як усё паспявае, Ірына разводзіць рукамі: «Натура ў мяне такая. Я і стыль ў адзенні спартыўны люблю, каб зручна было».

— Летам зламала правую нагу і два месяцы правяла на бальнічным. Муж жартаваў: «Была б левая — села б за руль і паехала на службу», — расказвае. — Не ведала, куды сябе падзець — сумна! З першага дэкрэтнага выйшла на работу, калі малому споўнілася паўтара года. Не пакідала пачуццё, што я дома сяджу, а за мяне там працуюць. Неяк сорамна.

Але і адпачываць, сцвярджае суразмоўніца, яна таксама ўмее:

— Раз на год ездзім на маю малую радзіму ў Калінінград. У мяне там бабуля, стрыечны брат, дзядзька. У вольны час люблю паглядзець савецкія мультфільмы. Сучасную анімацыю, акрамя некаторых работ, не разумею. Няма ў ёй душы. Чытаю фэнтэзі.

Ірына завочна заканчвае ВНУ. Вучыцца на юрыста. «Сядзець без справы не змагу. Ведаю, што дзеці ганарацца мной. Малодшыя сыны малююць маму на 8 Сакавіка не з кветкамі, а ў міліцэйскай форме».

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**



# Глядзець на свет праз аб'ектыў

**Напярэдадні Дня міліцыі ў Міністэрстве ўнутраных спраў падвялі вынікі конкурсу на найлепшую фота- і відэаработу. Яны былі прысвечаны дзейнасці органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў нашай краіны.**

За тры месяцы на адрас міністэрства прыйшло больш чым тры сотні работ. Адметна, што геаграфія ўдзелу ахапіла ўсе раёны Беларусі.



Фота прэс-службы МУС.

— Гэта адно з нестандартных мерапрыемстваў, якое праводзіцца сёлета. Галоўнае ў здымках — радасць і ўсмешка, якая пануе ў вачах дзяцей. Цікава, што аматары на роўных спаборнічалі з прафесіяналамі і нярэдка перамагалі, — заявіў **намеснік міністра ўнутраных спраў генерал-маёр міліцыі Сяргей ХАМЕНКА.** — Таму выбраць пераможцаў было для нас складана. Нецікавых работ не было. Кожная з іх адметная як па выкананні, так і па ўкладзеным у яе змест сэнсе... А ў выніку выбралі самыя жыццярадасныя здымкі.

Дасланыя работы датычыліся розных аспектаў. Большасць з іх закранала дзейнасць Дзяржаўтаінспекцыі. Напрыклад, у намінацыі «Дарожная бяспека» перамогу атрымала серыя сацыяльных відэаролікаў, створаная Сяргеем Марозавым. Вельмі актыўна ў конкурсе ўдзельнічалі дзеці. Іх бяспецы і марам былі адведзены намінацыі «Міліцыя — дзецям» і «Я б у міліцыю пайшоў».

Адкрывалі ж цырымонію ўзнагароджання лаўрэаты намінацыі «Гістарычная спадчына». Прыз і дыплом пераможцы атрымала Аляксандра Дудзецкая. Яна аўтар здымка «Ускладанне кветак загінуламу яфрэйтару С. Захараву». Герой яго — вайсковец, які служыць у часці 3214. Ён аддае даніну памяці салдату, што загінуў у Ваўкавыскім раёне. Але не падчас Вялікай Айчыннай, а ўжо пасля вайны, калі па лясах хаваліся ўзброеныя банды.

# Навука супраць злачыннасці

**У сценах Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў прайшла XX міжнародная навуковая канферэнцыя. Яна была прысвечана праблемам барацьбы са злачыннасцю і падрыхтоўцы кадраў для праваахоўных органаў.**

На дзевяці секцыях прагучалі даклады на многія тэмы. Сярод іх крымінальна-прававыя і крыміналагічныя аспекты барацьбы са злачыннасцю, актуальныя пытанні адміністрацыйнага права і працэсу і інш.

Сярод іншага, Акадэмія МУС падпісала пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі і навукі з Адукацыйным комплексам паліцыі Арменіі.

— На мерапрыемстве прысутнічалі прадстаўнікі МУС Беларусі, розных навучальных устаноў Расіі, краін Балтыі, Арменіі, — зазначыў **намеснік міністра ўнутраных спраў генерал-маёр міліцыі Сяргей ХАМЕНКА.** — Быў закрануты цэлы спектр пытанняў, якія датычыліся супрацоўніцтва праваахоўных органаў розных краін. Але падабенства ў тым, што ўсе прысутныя ставяць мэту, каб на тэрыторыі дзяржавы захоўвалася бяспека, а людзі, якія шукаюць і затрымліваюць злачынцаў, былі максімальна падрыхтаванымі. У аснове адно — ахова грамадскага парадку, і гэтае пытанне не мае межаў. Адкрыта прагучала думка: «Мы зараз рыхтуем нашу будучыню» — людзей, якія будуць кіраваць праз 25—35 гадоў.

**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего учреждению «Санаторно-оздоровительный комплекс «Белая Вежа»**

**Лот № 1:** не завершенный строительством объект с инвентарным номером 6852. Литер А1-А5. Назначение: нежилое здание. Площадь – 28261,10 кв. м. Готовность – 30 %. Кадастровый (или условный) номер 26:34:0:0:6852/177:1000/А1-А5. **Адрес:** Российская Федерация, Ставропольский край, г. Кисловодск, ул. Войкова, 39. **Начальная цена продажи, рос. руб. – 259 493 000,00 без учета НДС. Задаток, рос. руб. – 25 949 300,00. Шаг аукциона – 5 %**

**Земельный участок:** кадастровый номер: 26:34:000000:9923. Номер кадастрового квартала: 26:34:000000. Площадь: 53002+/-1 кв. м. Виды разрешенного использования: под строящийся санаторно-оздоровительный комплекс. Договор аренды земельного участка от 16.11.2017 № 321/2017 на срок по 15.11.2027

**Аукцион состоится 31.03.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. **Продавец:** Учреждение «Санаторно-оздоровительный комплекс «Белая Вежа», Российская Федерация, Ставропольский край, г. Кисловодск, ул. Войкова, 39, тел. +7 (928) 351-14-49. **Организатор аукциона:** РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9, тел. 8 (017) 324-70-57. Задаток для резидентов РБ перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск. **Получатель** – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 31.03.2020 (Лот № 1). Срок внесения задатка: – в рос. руб. – по 25.03.2020; – бел. руб. – по 30.03.2020 до 11.00. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00 и с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений: 30.03.2020 в 12.00. Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 04.05.2019.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 19.03.2020 повторного открытого аукциона (цена снижена на 65 %)**

**Лот № 1: капитальное строение с инвентарным номером 710/С-57497 – административное здание,** площадь 378,2 кв. м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-57496 – склад**, площадь 29,0 кв. м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-57495 – производственное здание**, площадь 569,4 кв. м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-78912 – тепловые сети,** протяженность – 63,9 м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-78914 – канализационная насосная станция**, площадь – 1 кв. м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-78913 – водопровод**, протяженность – 105,7 м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-78911 – канализационная сеть**, протяженность – 87,2 м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-78915 – благоустройство территории**, площадь – 2117,9 кв. м. Лот № 1 расположен по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Западная, 9А. Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 741000000003000383, площадь – 0,5155 га, расположен по адресу: г. Бобруйск, ул. Западная, 9А. **Обременения на объекты продажи:** арест (будет снят в случае продажи).

**Начальная цена продажи: 210 675,66 белорусского рубля с учетом НДС.** Сумма задатка: 21 067,57 бел. руб.

**Аукцион состоится 19 марта 2020 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок и внесение задатка: по 18.03.2020 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

Расчетный счет для перечисления задатка: получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** ОАО «Строительный трест № 12» Управляющая компания Холдинга «СТРОЙТРЕСТ-ХОЛДИНГ», УНП 700200537, г. Могилев, ул. Буденного, 11

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона, в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 15 (пятнадцати) календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 06.07.19, 18.09.2019, 02.11.19, 27.11.19, 15.01.20

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by. Дополнительную информацию можно получить по тел.: **+375222 72-41-14, +37529 624-26-25, сайт ino.by**


# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Выигрывай с Onliner 12»

Настоящие правила проведения Рекламной игры (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), определяют порядок проведения рекламной игры «Выигрывай с Onliner 12» (далее – Рекламная игра).

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующие значения:

**Интернет-сайт Организатора** – размещенный в глобальной сети интернет-сайт (интернет-ресурс), расположенный по адресу https://www.onliner.by.

**Пользователь** – физическое лицо, использующее интернет-сайт Организатора и соглашающееся с Правилами пользования ресурсом (https://blog.onliner.by/siterules).

**Учетная запись** – хранимая в компьютерной системе совокупность данных о пользователе сайта, необходимая для его аутентификации и предоставления доступа к его личным данным и настройкам.

**1. Организатор Рекламной игры**

1.1. Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 5 – 613, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

**2. Наименование Рекламной игры**

2.1. Настоящая Рекламная игра называется «Выигрывай с Onliner 12».

**3. Территория проведения Рекламной игры**

3.1. Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Сроки проведения Рекламной игры**

4.1. Срок начала Рекламной игры: 08.03.2020.

4.2. Срок окончания Рекламной игры: 08.05.2020.

**5. Цель проведения Рекламной игры**

5.1. Рекламная игра проводится с целью стимулирования написания отзывов на интернет-ресурсе https://www.onliner.by о реализуемых интернет-магазинами товарах, рекламируемых в разделе сайта https://catalog.onliner.by.

**6. Комиссия по проведению Рекламной игры**

6.1. Для проведения Рекламной игры Организатор создает комиссию по ее проведению (далее – Комиссия), осуществляющую контроль за соблюдением установленных Правил.

6.2. Состав Комиссии:

Председатель Комиссии

– Кажуро Денис Петрович, ООО «Онлайнер», директор.

Члены Комиссии:

– Жуковец Илья Николаевич, ООО «Онлайнер», заместитель директора по развитию;

– Ляшкевич Никита Александрович, ООО «Онлайнер», заместитель директора – начальник отдела маркетинга;

– Назаренко Лилия Александровна, ООО «Онлайнер», маркетолог отдела маркетинга;

– Сидорович-Юрченко Светлана Владимировна, ООО «БалансКонтакт», ведущий специалист по связям с общественностью.

**7. Участники Рекламной игры**

7.1. Участник – физическое лицо, являющееся зарегистрированным пользователем сайта https://www.onliner.by, выразившее желание принять участие в Рекламной игре на условиях, предусмотренных в настоящих Правилах.

7.2. В Рекламной игре могут принимать участие совершеннолетние граждане Республики Беларусь, а также совершеннолетние иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

7.3. Участниками Рекламной игры не могут быть лица, состоящие в трудовых отношениях с Организатором, члены комиссии, супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

7.4. Каждый участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии соблюдения требований, закрепленных в п. 8.1. – 8.3. настоящих Правил.

**8. Порядок участия в Рекламной игре**

8.1. Для участия в Рекламной игре Участник должен:

8.1.1. являться зарегистрированным пользователем интернет-сайта Организатора – https://www.onliner.by;

8.1.2. подтвердить свое согласие на участие в Рекламной игре в панели управления учетной записи пользователя на интернет-сайте Организатора – https://www.onliner.by. При этом в специальных полях указать свои фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) полностью до 05.04.2020 (включительно);

8.1.3. в период с 08.03.2020 по 05.04.2020 (включительно) оставить отзыв о любом товаре, размещенном в разделе сайта https://catalog.onliner.by. Исключение составляют товары, снятые с производства.

8.2. Отзыв должен относиться к приобретенному товару; представлять собой рассказ объемом не менее 10 (десяти) слов о потребительских свойствах и особенностях товара, личных впечатлениях от его использования; быть написан русским/белорусским литературным языком согласованными предложениями; соответствовать требованиям морали, не содержать ненормативной лексики, жаргона, оскорблений и т. п.; содержание отзыва не должно повторять содержание ранее опубликованных отзывов на сайте Организатора либо на иных сторонних интернет-ресурсах.

Организатор не несет ответственности за достоверность содержащихся в отзыве сведений. Комментарий о товаре является сугубо субъективным мнением автора отзыва.

8.3. Участниками Рекламной игры становятся пользователи, которые выполнили приведенные в п. 8.1. – 8.2. условия, отзывы которых прошли успешную модерацию (проверку) со стороны Организатора и были опубликованы на сайте https://www.onliner.by в период с 08.03.2020 по 06.04.2020 (включительно). Пользователи, отзывы которых были отклонены Организатором по причине их несоответствия настоящим Правилам, к участию в Рекламной игре не допускаются.

8.4. При оставлении отзыва пользователь в течение 30 минут после его написания получит на адрес электронной почты, указанный при регистрации на сайте https://www.onliner.by, письмо, в котором будет содержаться информация об уникальном номере, присвоенном отзыву. Уникальный номер присваивается автоматически и соответствует дате и времени оставления пользователем отзыва на сайте Организатора. После проверки комментария на предмет его соответствия настоящим Правилам Организатор уведомит автора об опубликовании либо отклонении (удалении) отзыва посредством сообщения, которое будет транслироваться пользователю в его учетной записи на сайте https://www.onliner.by в срок до 09.04.2020 (включительно).

**9. Призовой фонд**

9.1. Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств и имущества Организатора в размере **3762,54** (три тысячи семьсот шестьдесят два белорусских рубля пятьдесят четыре копейки).

9.2. Призовой фонд Рекламной игры:

| | Наименование приза | Количество, шт. | Стоимость за ед., белорусских рублей, с НДС | Всего стоимость, белорусских рублей, с НДС |
|---|---|---|---|---|
| Приз 1 | Мобильный телефон (смартфон) Honor 9X 4GB/128GB Sapphire Blue (STK-LX1) | 3 | 507,12 | 1521,36 |
| | Денежные средства в размере | | 54,86 | 164,58 |
| Приз 2 | Фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 (CRS-B19S) | 10 | 72,06 | 720,60 |
| Приз 3 | Фитнес-браслет (умный браслет) с экраном Honor Band 5 sport (AW70) | 40 | 33,90 | 1356,00 |
| **Итого:** | | | | 3762,54 |

**10. Время и место проведения розыгрыша призового фонда Рекламной игры**

10.1. Розыгрыш призового фонда проводится 10.04.2020 в 12.00 в присутствии Комиссии по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Дзержинского, 5 – офис 613, ООО «Онлайнер».

10.2. Розыгрыш проводится среди Участников, надлежаще выполнивших условия участия в Рекламной игре в соответствии с требованиями настоящих Правил.

**11. Порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения победителей Рекламной игры**

11.1. До момента проведения розыгрыша Комиссия формирует Список уникальных идентификаторов отзывов Участников Рекламной игры, которые успешно прошли этап модерации (проверки). Уникальные идентификаторы сформированы в Списке в порядке возрастания по дате и времени оставления пользователем комментария о товаре. Каждому уникальному идентификатору в Списке присваивается свой итоговый порядковый номер, который является участвующим в розыгрыше Игровым кодом. Нумерация Игровых кодов начинается с 1(единицы).

11.2. Список включает в себя следующую информацию: порядковый номер Игрового кода; уникальный идентификатор отзыва; дату и время оставления отзыва; дату и время опубликования отзыва; фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) полностью Участника.

11.3. Для проведения розыгрыша используется лототрон, состоящий из одной секции, и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9.

11.4. Определение выигрышных Игровых кодов получателей Призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из секции лототрона. Розыгрыш начинается с первого разряда слева.

11.5. Первый разряд Игрового кода определяется следующим образом: в секцию лототрона загружаются шары с номерами от «0» по цифру, соответствующую первому разряду зарегистрированного Игрового кода. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру первого разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Далее в сектор лототрона загружаются те номера шаров, которые существуют по сверенному списку Игровых кодов в соответствующем разряде. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру соответствующего разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Для определения последующих разрядов выполняются те же действия. Номера шаров вносятся в протокол.

11.6. Выигравшим «Приз 1» в розыгрыше считается Игровой код Участника, определенный согласно п. 11.3. – 11.5. настоящих Правил и каждый 500-й (пятисотый) следующий за ним в Списке, в количестве 2 (двух) Игровых кодов. Всего 3 (три) приза.

Выигравшим «Приз 2» в розыгрыше считается Игровой код Участника, определенный согласно п. 11.3. – 11.5. настоящих Правил и каждый 200-й (двухсотый), следующий за ним в Списке, в количестве 9 (девяти) Игровых кодов. Всего 10 (десять) призов.

Выигравшим «Приз 3» в розыгрыше считается Игровой код Участника, определенный согласно п. 11.3. – 11.5. настоящих Правил и каждый 100-й (сотый), следующий за ним в Списке, в количестве 39 (тридцати девяти) Игровых кодов. Всего 40 (сорок) призов.

В случае если выигрышный Игровой код Участника попадает на конец Списка, дальнейшее исчисление Игровых кодов продолжается с начала Списка.

11.7. Результаты розыгрыша фиксируются в протоколе, который подписывается всеми присутствующими членами Комиссии.

**12. Порядок уведомления победителей о результатах розыгрыша призов Рекламной игры**

12.1. Организатор до 16.04.2020 (включительно) уведомляет победителей письмом, высланным по адресу электронной почты, указанному Участником при регистрации профиля на сайте https://www.onliner.by, и путем направления соответствующего уведомления, которое будет транслироваться пользователю в его учетной записи на интернет-ресурсе Организатора. Организатор также вправе дополнительно уведомлять победителей любым удобным ему способом: посредством SMS-рассылки на номер телефона, звонком по телефону и др.

**13. Порядок получения выигрышей**

13.1. Для получения Приза победители должны явиться не позднее 08.05.2020 (включительно) по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 5 – офис 613, предварительно связавшись с Организатором по номеру многоканального телефона + 375 29 514-35-24.

13.2. Получить Приз можно с понедельника по пятницу с 10.00 до 17.00 (исключение составляют приходящиеся на официальные праздники дни), а также в субботу 25.04.2020 с 10.00 до 13.00. При получении Приза победитель предъявляет документ, удостоверяющий личность (паспорт – для граждан Республики Беларусь; вид на жительство в Республике Беларусь – для иностранных граждан и лиц без гражданства).

13.3. В случаях невозможности связаться с победителем для уведомления о выигрыше указанными в п. 12.1 способами; указания победителем недостоверных персональных данных в панели управления учетной записи пользователя на интернет-сайте Организатора; неявки победителя за получением Приза в определенный в п. 13.1 срок; непредоставления победителем Организатору сведений и документа, необходимых для получения Приза; письменного отказа победителя от получения Приза либо отказа от подписи в документах, подтверждающих передачу Приза, – победитель лишается права на получение Приза. В этих случаях Приз остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

13.4. В соответствии с главой 18 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор выступает налоговым агентом и при вручении победителям имущества «Приз 1» обязан удержать у последних причитающиеся им денежные средства в качестве уплаты подоходного налога с получателей указанных призов.

13.5. Расходы, связанные с проездом победителя к месту получения Приза, Организатором не возмещаются.

13.6. Призы замене не подлежат. Выплата денежного эквивалента Приза не осуществляется.

13.7. Призы не подлежат выдаче победителю иначе как в порядке, предусмотренном настоящими Правилами.

**14. Информация о Рекламной игре, публикация правил Рекламной игры**

14.1. Правила подлежат опубликованию до начала проведения Рекламной игры в газете «Звязда» и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в срок до 22.04.2020 (включительно) в газете «Звязда» и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.3. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на сайте Организатора – Onliner.by (https://b2bblog.onliner.by), а также по номеру многоканального телефона: + 375 29 514-35-24. Звонок платный в соответствии с тарифами операторов электросвязи, услугами которых пользуется Участник.

**15. Общие условия Рекламной игры**

15.1. Участие в рекламной Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участника с настоящими Правилами, принятие на себя обязательств по соблюдению всех условий и требований. Несоблюдение Участником требований настоящих Правил признается как его отказ от участия в Рекламной игре.

15.2. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участник соглашается с использованием его персональных данных в любых рекламных и/или иных информационных материалах, связанных с Рекламной игрой, права на которые принадлежат Организатору.

15.3. Организатор вправе отстранить Участника от участия в Рекламной игре, отказать в выдаче приза при нарушении последним требований настоящих Правил.

15.4. Ответственность за достоверность сведений, персональных и иных данных возлагается на Участника.

15.5. Организатор не несет ответственности за работу сети интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги по подключению к сети интернет Участника), операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т. д.) и почтовой службы (сроки доставки и т. д.).

15.6. Организатор не вступает с Участником в споры относительно определения собственника выигранного приза и/или претендента на его получение.

15.7. При наличии споров между Организатором и Участником Рекламной игры они разрешаются в установленном законодательством Республики Беларусь порядке.

15.8. Претензии по вопросам проведения Рекламной игры принимаются Организатором по адресу: Республика Беларусь, 220036, г. Минск, пр-т Дзержинского, 5 – офис 613, а также посредством электронной почты: game12@onliner.by.

*Свидетельство No 3753 о государственной регистрации Рекламной игры выдано 21 февраля 2020 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

Весткі з месцаў

# ПАМЯЦЬ ЖЫВЕ НА НАШАЙ ЗЯМЛІ

**У лютым на Расоншчыне праходзяць традыцыйныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да чарговай гадавіны з дня нараджэння Пятра Міронавіча Машэрава. Адпаведная экспазіцыя адкрыта ў школе мастацтваў, супрацоўнікі музея баявой садружнасці ладзяць для насельніцтва выязныя экспазіцыі.**



Сяргей САЛАЎЁЎ дэманструе вяскоўцам ручку Пятра Міронавіча.

Адна з іх адбылася ў Янкавіцкім сельскім Доме культуры. **Старшы навуковы супрацоўнік музея Хрысціна ЛЯШКОВА** і **галоўны захавальнік фондаў Сяргей САЛАЎЁЎ** зрабілі цікавы экскурс у саракавыя гады мінулага стагоддзя, калі Пётр Міронавіч вучыўся ў Дварышчанскай школе, а потым, пасля заканчэння педагагічнага інстытута, настаўнічаў у Расонскай.

Калі пачалася вайна, ён стаў адным з першых арганізатараў падпольнага руху, а потым і партызанскай барацьбы. Тут, на Расоншчыне, была закатавана і расстраляна яго маці — Дар'я Пятроўна. На месцы гібелі — яе ды іншых падпольшчыкаў — усталяваны помнік, да якога Машэраў часта прыязджаў, каб ускласці кветкі і аддаць даніну пашаны.

Ён памятаў сваю Расоншчыну, а Расоншчына помніць яго.

**А. Матошка,** *в. Янкавічы, Расонскі р-н.*

# НАПІСАНАЕ ЗАСТАНЕЦЦА

**Не так даўно выйшла ў свет кніжка нашых землякоў Настассі і Сяргея Кулакевічаў «Птушкі ляцяць на Палессе». Выданне гэта прымеркавана да 95-годдзя ўтварэння Жыткавіцкага раёна і пачынаецца з рэтраспектыўнага погляду аўтараў на гісторыю роднай Жыткаўшчыны, яе геаграфічнае становішча, эканоміку, культуру...**

Прамысловасць, адукацыя, выхаванне, народныя традыцыі і абрады — усё гэта цікавіла аўтараў і знайшло сваё адлюстраванне на старонках кнігі, значнае месца ў якой адведзена людзям. Сярод іх — кіраўнікі, педагогі, работнікі культуры, лясной і сельскай гаспадаркі, прамысловасці, простыя людзі... Апавядаючы пра іх, аўтары апісваюць, як жыў, развіваўся і раён у цэлым, і яго асобныя паселішчы, як рос дабрабыт людзей, павышаўся адукацыйны і культурны ўзровень, будаваліся новыя прадпрыемствы.

У кнізе знайшлося месца і ўспамінам, фотаздымкам, замалёўкам, вершам. Таму выданне, як падаецца, будзе цікавым не толькі для жыхароў раёна і горада.

**В. Нікановіч,** *г. Жыткавічы.*

Што бачу...

# У АДНЫМ САЛОНЕ

**Аўтобус Мінск—Глыбокае спыніўся ў Докшыцах. Прыпынак, што называецца, планавы, хвілін на 20. Мы, пасажыры, сядзім, чакаем, пакуль яны пройдуць, ды міжволі назіраем за прыгожай парачкай — маладым таткам і яго дачушкай.**

Малой гадкі тры, відаць. Вяртлявае дзіця: то з'едзе з татавых каленяў, то ўскараскаецца назад, шчабеча, усміхаецца... З твару бацькі не знікае замілаваная ўсмешка. Ён, што называецца, вачэй не зводзіць з дачушкі: то цалуе-абдымае, туліць да грудзей, то папраўляе валасы ды банцікі на косках... За імі ў радасць назіраць.

А вось слухаць даводзіцца зусім іншае: побач дзве жанчыны сядзяць. Аб чым гаварыць? Пакуль ехалі, гэтага не разабраць было. Калі ж аўтобус спыніўся...

Адна з жанчын, відаць, расказвала пра сваё жыццё-быццё: пра ўнукаў-выдатнікаў, пра дзяцей, якім так хочацца дапамагчы пабудаваць кватэру ў Мінску. Для гэтага, маўляў, яна трымае ў вёсцы кароўку, свінаматку, гадуе індыкоў... Каб потым амаль усё — і грошы, і прадукты — аддаваць дзецям...

— Ну і дурная, — абрывае яе суседка па сядзенні. — Сваё, можа, апошняе здароўе на іх кладзеш... Я так ніколі б не рабіла!

— А ў вас, прабачце, дзеці ёсць? — пытаецца ў яе той малады тата.

— Не... Няма, — чамусьці з форсам адказвае жанчына. — І ніколі не было!

— Яно і відаць... Бо калі былі б, дык апошнюю кашулю аддалі б...

Ён, магчыма, сказаў бы нешта яшчэ, але ў салоне аўтобуса раптам... грымнулі апладысменты, загучала нейчае:

— Во... А мы сумняваліся ў нашай моладзі!..

— Гэта вы мяне так сустракаеце? — здзівіўся апладысментам шафёр, вярнуўшыся ў кабіну. — Так рады, што я з'явіўся?.. Прабачце, сябра сустрэў — крыху затрымаўся.

— Мы рады, што вы затрымаліся, — за ўсіх адказала я. І мы паехалі далей.

**Зоя Наваенка,** *г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.*

Людзі і лёсы

# ПА ПРЫКЛАДЗЕ МАЦІ...

**Часам у канцы пражытага дня пачынаеш думаць, што ў ім добрага было, што не вельмі. Пашчасціла, напрыклад, нешта людскае зрабіць, і на душы — радасць, пазнаёміўся з цікавым чалавекам — свята.**

...Продкі Варвары Уладзіміраўны Міранович з аддаленай вёсачкі Калюжыцы — з ліку адукаваных, інтэлігентных. Да рэвалюцыі яны жылі ў так званым папоўскім доме з багатай бібліятэкай, з вялікай гаспадаркай.

Пасля рэвалюцыі царкву закрылі, сям'ю, дзе расло шасцёра дзяцей, выгналі з папоўскага дома, дзядулю арыштавалі. Патрабавалі, каб ён публічна адмовіўся ад Бога, на што той адказаў: «Ад сану свайго — магу, ад веры — ніколі». За што і быў расстраляны. А следам...

Гаспадарку канфіскавалі, бібліятэку вывезлі, іконы спалілі. Сям'я тулялася па хатах вяскоўцаў, жыла без права голасу і амаль без шанцаў уладкавацца недзе на працу. Для «ворагаў народа» ды іхніх дзяцей работы папросту не было. Таму не дзіва, што бацька Варвары, у зямлянцы пакінуўшы маці з малымі, добраахвотнікам пайшоў на вайну з фашыстамі, каб (так і сказаў) «...расчысціць дарогу дзецям». Іншых спосабаў даказаць сваю лаяльнасць да ўлады і радзімы ён на той час не бачыў.

І такі даказаў! Аднак, на жаль, цаною жыцця, бо сям'я атрымала кароткае паведамленне: «Загінуў смерцю храбрых».

Што заставалася матулі? Нічога, апроч барацьбы за выжыванне — часам на мяжы адчаю і з розніцай хіба ў тым, што цяпер на дзяцей прызначылі пенсію, што мясцовыя ўлады дапамаглі пабудаваць хаціну, «вылезці» з зямлянкі, што сям'і, як іншым сем'ям загінулых, калі-нікалі выдзялялі гуманітарную дапамогу з Амерыкі.

...У школе Варвара вучылася на адны «пяцёркі», уступіла ў камсамол, была галоўным завадатарам усіх мерапрыемстваў. А далей — дыплом філолага, любоў да сваёй прафесіі і дзяцей, самаадданае служэнне справе і, як вынік, званне заслужанай настаўніцы...

Дзякаваць богу, у працы ў яе шмат было радасці ды поспехаў! Менш, на жаль, у асабістым жыцці. Ва ўзросце 45 гадоў не стала мужа, цяжка хварэе адна з дзвюх дачок... Аднак Варвара Уладзіміраўна ў свае 85 радуецца таму, што мае, мужна адольвае ўсе выпрабаванні — па прыкладзе сваёй маці і бабулі, якім прыйшлося ў жыцці куды цяжэй.

**Ніна Бурко,** *Бярэзінскі раён.*

Чалавек на зямлі

# ...І СПОРЫЦЦА ТАДЫ ЛЮБАЯ СПРАВА

**З перасяленцамі Міхаілам і Наталляй Барысенкамі з вёскі Дабрамыслі мы сустракаліся не так даўно, мінулым летам, таму на гэты раз гутарка была як у даўніх знаёмцаў.**

— Мае родныя Просмычы сталі там, дзе зліваюцца Дняпро і Прыпяць, у нейкіх 17 кіламетрах ад Чарнігаўскай вобласці. Дабіраліся туды ў асноўным па вадзе. Я з захапленнем глядзеў на хвалі, марыў стаць капітанам, — успамінаў Міхаіл Іванавіч. — Пасля школы скончыў гомельскае рачное вучылішча, затым школу каманднага саставу і пачаў вадзіць цеплаходы.

Аднойчы на пірсе Міхаіл сустрэў Наталлю. Яна вучылася тады на повара і праходзіла практыку на іншым судне. Пажаніўшыся, маладая пара пасялілася ў Брагіне, каб зручней было ездзіць і да адных бацькоў, і да другіх. Праўда, Міхаіл тады змяніў прафесію: уладкаваўся механікам у ПМК, затым перасеў на экскаватар. Працаваў старанна, партрэт яго не раз змяшчалі на раённай Дошцы гонару, ды і зарабляў ён добра. Сям'я, дзе гадавалася ўжо двое дзетак, чакала, што хутка атрымае чатырохпакаёвую кватэру, а пакуль жыла ў сямейным інтэрнаце...

Што цікава, ужо тады ў абодвух сужэнцаў праявілася гаспадарчая жылка: Наталля купіла і прынесла дамоў маленькіх качанят, яе муж збудаваў невялічкі хлявок, дзе неўзабаве пасяліліся куры і нават два парсючкі. А потым...

— Вестка пра катастрофу на Чарнобыльскай АЭС дайшла да нас 28 красавіка, праз два дні, — успамінае Міхаіл Іванавіч. — Жонку з малымі я тут жа адправіў да брата ў Набярэжныя Чалны. Сам разам з іншымі мужчынамі з ПМК да жніўня працаваў у 30-кіламетровай зоне — праводзілі дэзактывацыю, капалі абводныя каналы.

Калі атрымалі дазвол на выезд, Міхаіл і яго таварышы-меліяратары сталі шукаць месца, дзе можна было б жыць і працаваць. Так апынуліся ў Дабрамыслях, забралі да сябе сем'і.

— Абжываліся тут з нуля, — уступае ў размову



Наталля Анатолеўна. — Жылі спачатку ў будынку старога дзіцячага садка — кватэру атрымалі пазней... А бацькі мае з зоны пераехалі ў Арцёмава, набылі карову, каня, завялі гаспадарку. Мы штодня ездзілі дапамагаць ім.

Цяпер гаспадарка ўжо ў Дабрамыслях: з каровай (без яе Барысенкі, можна сказаць, не жылі), з ладнай цялушкай, «свінствам». Яно было ў іх розных парод. Спыніліся на вялікай беларускай белай, бо парасяты ад гэтых свіней досыць хутка растуць (а тым больш на адгоне і сыроватцы)... Сала ды мяса хапае потым надоўга — і сабе, і дарослым дзецям, якія жывуць у Віцебску, але з радасцю прыязджаюць да бацькоў... Старэйшая ўнучка Арына (ёй 15) дык проста вырасла на вясковым сырадоі: кароўку з поля заўсёды сустракала з кубачкам у руках...

Лішкі малака Барысенкі прадавалі і прадаюць аднавяскоўцам, у тым ліку — падапечным Наталлі Анатолеўны, якая працуе сацыяльным работнікам.

А наогул ва ўмелых руках спорыцца любая справа. Неяк, напрыклад, гаспадар на сваім участку знайшоў чацвярых маленькіх зайчанят. У няволі яны рэдка выжываюць, а на гэтым падворку гадаваліся як звычайныя трусы. За лета «пацяжэлі» амаль да трох кілаграмаў... Хоць птушак, як прызнаецца гаспадыня, яна любіць больш. І сапраўды, на двары — апроч курэй і качак — ходзяць індыкі, прычым незвычайныя: свацця з Беразіна ўпадабала кросаў-велікаў БІГ-6, купіла птушанят і для Барысенкаў.

— Клопату з імі болей, — прызнаецца Наталля Анатолеўна. — Цеплалюбівая парода. Мы з полікарбанату ім крыты загон пабудавалі, зімой трымаем у самым цёплым куце хлява, дзе суха і няма скразнякоў... А карміць іх не так і складана. Раніцай і днём даём мешанкі з кашы, мясных, малочных, рыбных рэшткаў, вечарам — сухое зерне (для іх найбольш карысны авёс). Улетку — шмат рознай зеляніны і гародніны, час ад часу купляем спецыяльны камбікорм, дзе ўсё збалансавана... Чытала, што гэтыя кросы вырастаюць да 25 кілаграмаў. Не дужа верыла, але ўсе мае індыкі заважылі нават болей, а самы вялікі быў два пуды! Так што птушка выгадная. Да таго ж індычына смачнейшая за кураціну і больш карысная. Парачку мы пакінулі на развод.



Іншымі словамі, на цяжкасці Барысенкі не скардзяцца: зямлі ў іх цэлы гектар, сена з трох укосаў, гародніны рознай шмат.

...На развітанне я зрабіла некалькі фотаздымкаў. На адным — парачка індыкоў ганарліва пахаджвае сярод іншай птушкі, штосьці абмяркоўвае на сваёй буркатлівай мове. Прыгожа...

**Таццяна Ігнаценка,** *г. п. Лёзна.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

# «Людзі застаюцца працаваць

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Летась прадпрыемствамі нашай вобласці выраблена прадукцыі на суму больш за 23 мільярды рублёў, што з'яўляецца самым вялікім аб'ёмам сярод рэгіёнаў краіны. Каля 65 % усяго аб'ёму вырабленай прадукцыі гомельскіх прадпрыемстваў экспартуецца. Унёсак вобласці ў сумарны экспарт краіны складае 12,5 %. Увогуле ж аб'ём валавога рэгіянальнага прадукту па леташніх выніках склаў 13,5 мільярда рублёў — гэта крыху больш за 10 % аб'ёму валавога ўнутранага прадукту краіны. У будаўнічай галіне нядаўна рэалізаваны шэраг важных праектаў. На ААТ «Гомельшкло» арганізавана вытворчасць энергазахавальнага шкла, BYR Energy Efficiency and Generation Limited пабудавалі на тэрыторыі Брагінскага раёна аб'екты па выпрацоўцы электраэнергіі на аснове натуральнага сонечнага выпраменьвання. Апошнім часам прайшла і мадэрнізацыя ААТ «Гомельбудматэрыялы».

***— На Гомельшчыне цяпер вялікія надзеі ўскладаюцца на аб'екты, пабудаваныя з удзелам кітайскага капіталу. Некаторыя пачалі працаваць, іншыя чакаюць уводу ў эксплуатацыю. Які эфект для вобласці яны дадуць?***

— Мы з нецярпеннем чакаем, калі новыя вытворчасці, створаныя на базе Добрушскай папяровай фабрыкі «Герой працы» і ААТ «Светлагорскі ЦКК», пачнуць працаваць на поўную магутнасць. Завод па выпуску кардону ў Добрушы пачне дзейнічаць да канца года. 10 лютага Прэзідэнт краіны падпісаў указ, якім прадугледжваюцца меры, накіраваныя на рэалізацыю інвестыцыйнага праекта па арганізацыі вытворчасці кардону. У дакуменце ёсць і пэўныя тэрміны яго завяршэння: увод у эксплуатацыю комплексу сёлета, а выхад на праектную магутнасць — у 2022 годзе. Што датычыцца Светлагорскага ЦКК, там Прэзідэнт Беларусі ажыццявіў сімвалічны пуск абсталявання лініі па вытворчасці сульфатнай беленай цэлюлозы. Мы ўжо бачым вынік работы новай вытворчасці ў Светлагорску. Атрымалася дасягнуць больш чым 90 % загрузкі магутнасцяў, больш за 75 % вырабленай прадукцыі экспартуецца. Плануем, што сёлета новы завод выйдзе на поўную праектную магутнасць. Рэалізацыя гэтых праектаў дазволіць не толькі стварыць новыя рабочыя месцы з годнай заработнай платай, але і павялічыць паступленні ў бюджэт у выглядзе падатковых адлічэнняў. Таксама гэта дасць магчымасць прадпрыемствам краіны не закупляць прадукцыю з-за мяжы, а, наадварот, прыцягнуць у краіну валюту.

***— Знакавым для Гомельшчыны з'яўляецца будаўніцтва горна-абагачальнага камбіната ў Петрыкаве. Як яго ўвод паўплывае на развіццё райцэнтра ў прыватнасці і ўвогуле беларускага Палесся? Ці будуць праекты такога ж узроўню на Гомельшчыне ў найбліжэйшай перспектыве?***

— Петрыкаўскае радовішча калійных солей на сённяшні дзень — самае перспектыўнае. Яго распрацоўка дазволіць не толькі падтрымаць рудную базу ААТ «Беларуськалій», але і істотна павялічыць вытворчыя магутнасці прадпрыемства, якое будзе выпускаць новыя віды прадукцыі і паспяхова канкураваць на сусветным калійным рынку. Рэалізацыя праекта дазволіць забяспечыць прадпрыемства сыравіннымі запасамі да 7,2 мільярда тон. Праект знаходзіцца на завяршальнай стадыі. У планах — за тры гады выйсці на праектную магутнасць. Улічваючы маштаб праекта, а гэта каля двух мільярдаў долараў інвестыцый, мы разлічваем на тое, што ён станоўча паўплывае на сацыяльна-эканамічнае развіццё Петрыкаўскага раёна і Гомельскай вобласці ўвогуле. Тут будзе створана амаль дзве тысячы новых рабочых месцаў. Дзякуючы рэалізацыі праекта актыўна пашыраецца жыллёвае і грамадскае будаўніцтва. Летась здадзены ў эксплуатацыю жылыя дамы для работнікаў Петрыкаўскага ГАКа, працягваецца рэканструкцыя дома на вуліцы Заслонава, будуецца шматкватэрны жылы дом у мікрараёне № 21. Сёлета ў мікрараёне «Паўночны», дзе пражываюць супрацоўнікі ААТ «Беларуськалій», плануецца ўзвесці яшчэ адзін дом, а таксама дзіцячы садок на 240 месцаў. Новыя маштабныя інвестыцыйныя праекты прапрацоўваюцца на МНПЗ, БМЗ і Гомельскім хімічным заводзе. Пачата рэалізацыя вельмі важнага для рэгіёна праекта па будаўніцтве рачнога порта Ніжнія Жары ў Брагінскім раёне, што дазволіць забяспечыць выхад да мора па водным шляху.



Фота БелТА.

Сімвалічны пуск абсталявання лініі па вытворчасці сульфатнай беленай цэлюлозы на Светлагорскім ЦКК.

***— Сёння шмат гавораць пра развіццё лічбавай эканомікі. Якія планы ў гэтым кірунку ёсць на Гомельшчыне?***

— Вялікае значэнне будзе мець стварэнне лічбавых платформаў для канвергенцыі розных сектараў эканомікі ў межах лічбавізацыі краіны. Важным крокам стане развіццё інфраструктуры воблачных тэхналогій (цэнтраў апрацоўкі даных). Адмысловая ўвага будзе звернута на аптымізацыю электроннага дакументазвароту ў сферах дзяржаўнага кіравання і бізнесу. Завяршаецца перавод пераважнай колькасці адміністрацыйных працэдур у электронную форму. Адбудзецца пераход дзяржаўных органаў і арганізацый на выкарыстанне тэхналогіі «воблачных вылічэнняў» пры апрацоўцы і захоўванні інфармацыі. На Гомельшчыне рэалізуецца праграма «Разумны горад». У яе аснове — комплексны падыход да павышэння якасці жыцця насельніцтва і памяншэння выдаткаў пры кіраванні рэгіёнам шляхам прымянення сучасных інфармацыйных тэхналогій у сацыяльнай сферы і вытворчым сектары. Якасна новы ўзровень сельскай гаспадаркі грунтуецца на развіцці арганічнага земляробства, вытворчасці экалагічна бяспечных прадуктаў, паскораным развіцці аграбізнесу, укараненні адаптыўна-ландшафтных сістэм земляробства.

***— Генадзь Міхайлавіч, пашырэнне прадпрымальніцкага сектара — адзін з самых важных індыкатараў рэгіянальнага развіцця. Ці вычарпаны тут рэзервы?***

